Рэцэнзіі

Н.И.Толстой. **Избранные труды. Том II: Славянская литературно-языковая ситуация.** М.: "Языки русской культуры", 1998. 544 с.

Другі том "Выбраных прац" акадэміка Мікіты Ільіча Талстога (пра першы том гл. "Веснік БДУ". Сер.4. №1. 1998) прысвечаны пытанням развіцця славянскіх літаратурных моў. Гэтая тэматыка раней разглядалася ў яго кнізе "История и структура славянских литературных языков" (М., 1998), з 16 раздзелаў якой у "Выбраныя працы" трапіла 6 артыкулаў. Усяго ж другі том змяшчае 25 прац М.І.Талстога, а таму можна гаварыць пра цалкам самастойную каштоўнасць выдання, тым больш, што два артыкулы друкуюцца ўпершыню, а 13 публікацый былі надрукаваны ў апошняе дзесяцігоддзе, часта ў цяжкадаступных для нас выданнях. Як і першы том, кніга ўзорна аформлена ў паліграфічных і ў навукова-тэхнічных адносінах, чаму садзейнічалі выдавец, рэдактар і карэктар тома А.Д.Кошалеў, С.М.Талстая і М.М.Талстая.

Кніга складаецца з чатырох частак. Першая прысвечана агульным асаблівасцям славянскіх літаратурна-моўных сітуацый (с.9–63), другая – функцыяніраванню старажытнаславянскай літаратурнай мовы (65–181), трэцяя – культурна-моўнай сітуацыі ў паўднёвых славян, галоўным чынам – сербаў (183–419), а чацвёртая – асобным пытанням гісторыі рускай літаратурнай мовы (421–506). Кнігу завяршае старанна складзеныя вялікі спіс цытаванай літаратуры і звесткі пра першыя публікацыі змешчаных прац. Зразумела, што для беларускага чытача найбольшую цікавасць ўяўляюць дзве першыя часткі, хаця важная для беларусістаў інфармацыя ёсць у трэцяй і ў чацвёртай. Заўважым, што артыкул, у якім выказваюцца погляды М.І.Талстога на спробу стварэння паляшуцкай літаратурнай мовы (супраць якой выступалі некаторыя беларускія філолагі-пісьменнікі, у прыватнасці Ніл Гілевіч, а іншыя, напрыклад Алег Лойка, глядзелі на яе досыць спакойна, што, на мой асабісты погляд, больш абгрунтавана), відаць, трэба было перанесці з чацвёртага ў першы раздзел кнігі.

У дакладах М.І.Талстога апошніх гадоў па-новаму ўскрываюцца глыбокія сувязі паміж мовамі і культурамі, робіцца спроба пабудаваць сістэму іерархічных паралелей паміж мовамі, літаратурамі і культурамі: літаратурная мова – прастамоўе – дыялект – арго – ідыялект – (мова асобы); мастацкая літаратура – народная гарадская літаратура – агульнанародны фальклор – сацыяльны фальклор – славесная творчасць індывіда; элітарная культура – "трэцяя" (нізавая гарадская) культура – традыцыйная народная культура – традыцыйная прафесійная культура – ідыялектная (індывідуальная) культура. Адсюль Талстой прыходзіць і да ідэі аб сувязі згаданых форм культуры з самасвядомасцю (рэлігійнай – дзяржаўнаснай – агульнаплемянной – агульнанароднай – прыватнаплемянной (мясцовай) – індывідуальнай). Відаць, згаданыя думкі Талстога яшчэ доўга будуць прадметам абмеркавання і пошукаў іх паглыблення і ўдакладнення, але прадуктыўнасць гэтых разважанняў не выклікае сумнення.

Праз усе працы Талстога аб літаратурных мовах праходзіць таксама ідэя пра роль старажытнаславянскай літаратурнай мовы, створанай Кірылам і Мяфодзіем і прадоўжанай аж да нашага часу ў выглядзе зводаў царкоўнаславянскай мовы, у развіцці славянскіх літаратурных моў. Талстой лічыць, што ў народаў, мовы якіх належаць да арэалу Pax Slavia Orthodoxa (Свет праваслаўнай Славіі), старажытнаславянская мова на працягу пэўнага часу была адзінай літаратурнай мовай, паралельна з якой у жанрах дзелавых дакументаў і прыватнай карэспандэнцыі развівалася пісьмовае выкарыстанне мясцовай народнай мовы. Старажытнаславянская мова як сакральная ўжывалася ў канфесійных мэтах. Паступова выкарыстанне старажытнаславянскай мовы распаўсюдзілася на публіцыстычная і мастацкія творы. Талстой будуе схему іерархічнага жанрава-стылістычнага размеркавання пісьмовых тэкстаў, паводле якога адбывалася і трансфармавалася прымяненне старажытнаславянскай літаратурнай і мясцовай мовы, што ператваралася ў літаратурную. Старажытнаславянская мова станавілася стылем новай літаратурнай мовы (як гэта адбылося, на думку аўтара, з рускай мовай). Інакш было ў тых славян, дзе функцыя сакральнай мовы ўскладалася на

лацінскую (Pax Slavia Latina): тут літаратурная мова ўзнікала *незалежна ад сакральнай*, абапіраючыся на народныя гаворкі (польская, чэшская, славацкая, славенская, сербалужыцкія мовы). Але ў некаторых мовах адбывалася ў тым ці іншым парадку сутыкненне гэтых тэндэнцый (так, у харватаў доўгі час захоўвалася і ўплывала на моўную сітуацыю ў цэлым група глагалітаў, якія захоўвалі глагалічную пісьменнасць, а з ёю і старажытнаславянскія тэксты). Асаблівая ўвага ў кнізе засяроджваецца на развіцці "заходнерускай" (стараўкраінскай і старабеларускай) літаратурнай мовы. Тут, паводле Талстога, на познім этапе адбывалася адштурхоўванне ад традыцый старажытнаславянскай літаратурнай мовы і раўненне на народную мову. І зноў паўтару: тут патрэбна не столькі прыняцце тых ці іншых думак, колькі вялікая работа над канкрэтным аналізам тэкстаў з улікам выказаных ідэй у працэсе сучаснага асэнсавання гісторыі беларускай літаратурнай *мовы. Пра беларускую і асабліва старабеларускую* мову Талстой піша шмат, у прыватнасці на старонках 28, 39, 75, 78–80, 82, 102, 106, 108, 112, 114–115, 117–120, 122–131, 136, 138, 141, 150, 154, 161, 162, 164, 175, 176, 180, 445, 446, 448, 452. Я знарок прывёў гэты спіс старонак не толькі дзеля таго, каб стала ясна, што беларуская мова была аб'ектам спецыяльных разважанняў *Талстога, але і для аблягчэння карыстання* томам для беларусістаў (паколькі прадметнага паказальніка ў кнізе няма).

Другі том прац М.І.Талстога – кніга сучасная і вельмі жывая. І таму ёй наканавана доўгае і актыўнае жыццё. "Выбраныя працы" выходзяць у серыі "Мова. Семіётыка. Культура", што надзвычай дакладна падыходзіць да зместу кніг. Хочацца пажадаць выдаўцу і рэдактару поспехаў ў іх высакароднай і патрэбнай рабоце.

А.Я.Супрун

Т.М.Валынец. **Грамматический феномен причастия.** Мн.: Издательский центр БГУ, 1998. 138 с.

У манаграфіі размова ідзе аб дзеепрыметніках сучаснай рускай мовы. Пры характарыстыцы граматычнай спецыфікі дзеепрыметнікаў, іх месца ў сістэме часцін мовы Т.Валынец абапіраецца на вынікі сваіх назіранняў над тым, як у канкрэтных ўмовах ужывання дзеепрыметнікі суадносяцца з фінітнымі формамі дзеяслова. Большая частка манаграфіі (с.15–96) прысвечана апісанню пераўтварэнняў дзеепрыметнага азначэння ў дзеяслоўны выказнік: аб'ектам даследавання з'яўляюцца *канкрэтныя трансфармацыі* "дзеепрыметнік–прэдыкатыўныя дзеясловы" (с.9). Прызнаецца, што ў трансформе захоўваецца дэнататыўны змест зыходнага сказа. Тэма-рэматычныя і стылістычныя зрухі пры гэтым апускаюцца (даданыя азначальныя, якія замяшчаюць дзеепрыметнікі, пастаянна ўводзяцца стылістычна маркіраваным займеннікам *что*).

Хаця звесткі аб тым, што кожны дзеепрыметнік пераўтвараецца ва ўласны дзеяслоў, адносяцца да разраду хрэстаматыйных, да гэтага часу, паколькі мне вядома, не існавала прац, у якіх вывучаўся б трансфармацыйны патэнцыял рускіх дзеепрыметнікаў. Даследаванне Т.Валынец запаўняе існуючы прабел і ўжо таму каштоўнае і нетрывіяльнае.

Эксперыментальны матэрыял разбіты аўтарам на тры часткі.

У першай прадстаўлены прыклады, у якіх граматычныя характарыстыкі зыходных дзеепрыметнікаў і дзеясловаў у трансформах супадаюць (мы бы сказалі, аднолькава названы): *солнце, освещающее Землю, – солнце, которое освещает Землю; человек, приехавший издалека, – человек, который приехал издалека.* Тут звяртаецца ўвага на тое, што ў падобных выпадках дзеепрыметнік далёка не заўсёды пераўтвараецца ў даданы азначальны. Яму могуць адпавядаць і даданы дапаўняльны, які матывуе даданы акалічнасны, частка складаназлучанага сказа, а таксама аднародны выказнік ускладненага сказа. У граматычных апісаннях рускай мовы гэтыя звесткі аб дзеепрыметніках адсутнічаюць.

У другой частцы *ахарактарызаваны выпадкі*, у якіх граматычныя прыметы дзеепрыметнікаў і іх дзеепрыслоўных трансформ не супадаюць: *Фонари <...> разгорались толчками, словно раздуваемые ветром. – Фонари <...> разгорались толчками, словно (их) раздувал ветер* (с.23 і інш.)

Гэты раздзел манаграфіі асабліва цікавы. Аўтар *уводзіць паняцце* функцыянальна-семантычнай парадыгмы дзеепрыметніка, што з'яўляецца новым у апісанні матэрыялу. У рабоце даецца састаў парадыгм для кожнага тыпу дзеепрыметнікаў, выдзелены стандартныя і нестандартныя трансфармацыі, выяўлены магчымасці варыянтных пераўтварэнняў, калі адной і той жа дзеепрыметнай форме адпавядаюць некалькі форм дзеяслова (напрыклад, дзеепрыметнік залежнага стану прошлага часу закончанага трывання можа замяшчацца формамі прошлага часу дзеясловаў закончанага і незакончанага трывання).

Трансфармацыйны метад, прыняты за аснову аналізу, дазволіў аўтару не толькі заўважыць факты, якія звычайна выпадаюць з-пад увагі даследчыкаў, але і намеціць новы аспект вывучэння такога традыцыйнага аб'екта, як дзеепрыметнік. Хацелася б пажадаць аўтару прадоўжыць сваё даследаванне і ў далейшым атрымаць вынікі, якія б дазволілі ад канстатацыі з'яў перайсці да абагульненняў, якія фармулююць правілы.

У трэцюю частку ўвайшлі прыклады, у якіх дзеепрыметнік не можа быць пераўтвораны ў выказнік: *как дед Мазай вытаскивал ужасных беженцев из несущегося потока, так <...>* (с.24).

Гэтая група толькі абазначана і падрабязна не ахарактарызавана, але і вылучэнне яе з'яўляецца важным, таму што сведчыць аб неабходнасці адрозніваць сувязі дзеепрыметніка з дзеясловам на ўзроўні моўнай сістэмы і канкрэтнага ўжывання.

Ёсць у манаграфіі тое, што прадстаўляецца мне супярэчлівым ці ва ўсялякім разе патрабуе дадатковага абгрунтавання.

Асэнсаванне аналізуемага матэрыялу прыводзіць аўтара, як думаецца, да правільнага выводу аб тым, што нестандартныя трансфармацыйныя пераўтварэнні з'яўляюцца тэкставымі рэалізацыямі "граматычнага (семантычнага) зместу